

ЯЕ ЛЁСАМ СТАЎ ЛЕС

ЧЫРВОНКА

«АТЛАНТЫДА» СТУДЭНТА МІКІТЫ ВУШАВА

ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 МАЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 94 (28961)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей РУМАС, прэм'ер-міністр:**

*«У 1-м квартале выканана шэсць з сямі найважнейшых параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця. Не выкананы толькі паказчык па экспарце тавараў і паслуг. Мы ў найбліжэйшы час установім алгарытм, як мы будзем працаваць па экспарце, каб тыя міністэрствы, дзяржорганы, пасольствы, якія не выконваюць гэты паказчык, штомесяц адчувалі напружанне, і па выніках паўгоддзя мы ўвайшлі б ва ўстаноўленыя заданні. За студзень — сакавік экспарт тавараў знізіўся на $250 млн — гэта на 3,2 % ніжэй, чым у аналагічным перыядзе 2018 года. Знізіліся аб'ёмы экспарту прадуктаў нафтаперапрацоўкі, грузавых аўтамабіляў, машын для ўборкі сельгаскультур. Затое істотна прыраслі па экспарце паслуг у IT-сферы — 30 %, прыбавілі і ў сферы транспартных паслуг — 2,5 %».*

## КОРАТКА

• **Сярэдні заробак у Беларусі ў красавіку склаў Br1074.**

• У Брэсцкай крэпасці ўчора сустрэлі 25-мільённага наведвальніка.



• **У студзені — красавіку БелАЗ у 1,3 раза павялічыў экспарт у краіны далёкага замежжа.**

• Беларускія медыкі выканалі рэтрансплантацыю печані жыхарцы Японіі.

• **Зборная Беларусі займае 14-е месца ў рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі хакея (IIHF).**

• Жыхар Слуцка шукаў магнітам ключы ў рацэ Случ і знайшоў мінамётную міну часоў Вялікай Айчыннай вайны.


ISSN 1990 - 763X


# АГЛЯД ПЧАЛІНАЙ ГАСПАДАРКІ



Уладзімір ГУШЧА *(на фота злева)* і Аляксандр ХРЫТАНОВІЧ жывуць у вёсцы Заазер'е Сенненскага раёна. У вёсцы, дзе зусім няшмат жыхароў, іх падворкі знаходзяцца побач. Не толькі суседства, але і аднолькавы карысны занятак зблізае мужчын — пчалярства. Болей за трыццаць гадоў таму яны асвоілі тэхналогію ўтрымання пчол, паставілі на сваіх прысядзібных участках па некалькі дзясяткаў пчаліных домікаў і паспелі стаць сапраўднымі карыфеямі мядовай справы. Уладзімір Паўлавіч у маладосці дапамагаў свайму бацьку, пчаляру-аматару, і атрымаў ад яго мудрыя парады. А яго сусед Аляксандр Іванавіч, працуючы ў калгасе трактарыстам, а потым і ў лясніцтве, пасябраваў з лясгасаўскім пчаляром і засвоіў ад яго каштоўную навуку. Гэтымі днямі суседзі на сваіх пчальніках праводзяць чарговы агляд перадроевага стану пчол — ужо чацвёрты пасля гэтай зімы, дапамагаючы адзін аднаму, дзеляцца вопытам «салодкага» рамяства.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Грамадскі клопат

# ІДЭІ ДЛЯ ЛЕПШАГА ЖЫЦЦЯ

## Якія сацыяльныя ініцыятывы беларусаў атрымалі прызнанне на Social Weekend

**Трэнінгі для бацькоў неданошаных дзяцей, стварэнне інклюзіўнага пляжа для людзей з інваліднасцю на тэрыторыі Мінскага мора, народны маніторынг дробных часціц у паветры, якія з'яўляюцца фактарамі рызыкі развіцця сур'ёзных захворванняў, — гэтыя і яшчэ 12 праектаў-фіналістаў змагаліся за прызавы фонд у 75 000 рублёў трынаццатага сезона конкурсу сацыяльных праектаў Social Weekend. Нядаўна былі названыя праекты-пераможцы.**

### *Людзі з ДЦП хочуць вучыцца, працаваць, займацца спортам і... жыць як усе*

Яна Кармаш з Брэста калісьці не магла трапіць ракеткай па мячы, а цяпер яна кандыдат у майстры інваспорту, чэмпіёнка Беларусі па настольным тэнісе сярод людзей з парушэннем апорна-рухальнага апарату. У 13-м сезоне конкурсу сацыяльных праектаў Social Weekend дзяўчына прадставіла праект свайго трэнера Юрыя Лагадзюка «Рэабілітацыя дзяцей з ДЦП праз настольны тэніс», які дапамог сотням хлопчыкаў і дзяўчынак з інваліднасцю стаць на п'едэстал і адчуць сябе чэмпіёнамі. Гэты праект атрымаў Гран-пры конкурсу, а выступленне Яны — самыя бурныя і доўгія апладысменты гледачоў.


СТАР. 13


Праблема

# КУДЫ ВЕЛАДАРОЖКА ПРЫВЯДЗЕ

## Ровар — экалагічны транспарт ці галаўны боль для пешаходаў і шафёраў?

**За апошнія дзесяць гадоў у Беларусі стаўленне да веласіпедаў і іх уладальнікаў змянілася карэнным чынам. Мець «двухколага коніка» цяпер не меней модна, чым аўтамабіль. Дабірацца на ім на працу — значыць быць у трэндзе. У адным толькі Мінску налічваецца каля 800 тысяч веласіпедаў, для бяспечнага руху якіх актыўна ствараюцца камфортныя ўмовы. Аднак дзіўная рэч: некаторыя веласіпедысты пачалі паводзіць сябе быццам тая бабка з казкі пра залатую рыбку. Чым больш для іх робіцца, тым большага яны патрабуюць.**


СТАР. 4




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Супрацоўніцтва

# НЕ ТОЛЬКІ ПРА ТУРЫЗМ

## Прэзідэнт Грузіі Саламэ Зурабішвілі прыедзе ў Мінск на адкрыццё ІІ Еўрапейскіх гульняў

**Падчас візіту кіраўніка Грузіі ў беларускую сталіцу запланаваны разнастайныя сустрэчы на вышэйшым і высокім узроўні. А ўжо праз два месяцы — 25 жніўня — плануецца ўдзел у адкрыцці Грузінскага дома ў Мінску прэм'ер-міністра Мамукі Бахтадзэ. Гэтыя падзеі анансаваў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Грузіі ў Беларусі Валерый КВАРАЦХЕЛІЯ падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай Дню Незалежнасці Грузіі, які будзе адзначацца 27 мая.**

Грузінскі гандлёвы дом, які размясціўся па вуліцы Куйбышава, будзе працаваць у фармаце выстаўкі-продажу. Зараз у будынку заканчваецца рамонт. У новым цэнтры можна будзе не толькі набыць грузінскія прадукты, але і пазнаёміцца з культурай, прадэгуставаць стравы, прыняць удзел у прэзентацыях.

Асноўнай сферай супрацоўніцтва Беларусі і Грузіі апошнім часам стаў турызм. Усё больш беларускіх падарожнікаў адкрываюць для сябе каларыт Каўказа — мора, кухню, горы і гасціннасць. За студзень—красавік 2019 года Грузію ўжо наведалі 9000 беларускіх турыстаў, што амаль на 43 % вышэй у параўнанні з двума мінулымі гадамі. Папулярнасцю карыстаюцца аўтобусныя туры, хутчэйшы і больш камфортны авіятранспарт падыходзіць не ўсім — цэны на білеты «кусаюцца». Па словах Валерыя Кварацхеліі, перагаворы з авіяперавозчыкамі па гэтай праблеме праводзяцца рэгулярна, але пакуль прыйсці да згоды не атрымліваецца.

Грузія зацікаўлена развіваць з Беларуссю сумесныя прадпрыемствы. Дарэчы тут і яе бяспошлінны гандаль з Еўрапейскім саюзам, Кітаем,Турцыяй. Праз некалькі месяцаў такая дамоўленасць будзе і з Індыяй. Пры гэтым Валерый Кварацхелія заяўляе, што краіна вызначыла для сябе еўрапейскі вектар развіцця.

Ва ўзаемадзеянні Беларусі і Грузіі з'яўляюцца і новыя тэмы. «Вельмі падабаюцца нам электробусы «Белкамунмаша». Калі па кошце дамовімся, у Тбілісі яны з'явяцца. Вельмі добрыя адносіны ў сферы ІТ-тэхналогій. У гэтай справе вы далёка наперадзе, на мой погляд», — сказаў пасол.

**Любімае беларусамі свята «Тбілісоба» адбудзецца ў Мінску 24 жніўня. Валерый Кварацхелія звярнуў увагу, што сёлета да мерапрыемства падрыхтаваны шматлікія сюрпрызы, і яно зайграе новымі фарбамі. «Галоўнае, каб было надвор'е добрае. Астатняе, я вам гарантую, будзе выдатным», — запэўніў пасол.**

Грузінскія ўрачы прыязджаюць у Беларусь на павышэнне кваліфікацыі. Беларускія фармацэўты выказваюць намер адкрыць сумесную вытворчасць у гэтай краіне Закаўказзя.

Пасол падкрэсліў, што ў краін няма ніякага рознагалосся і па асноўных палітычных пытаннях. Беларусь і Грузія сёлета адзначаюць 25-годдзе заснавання дыпламатычных адносін. Узаемадзеянне прайшло значны шлях: ад адсутнасці кантактаў пасля распаду Савецкага Саюза да сумеснай вытворчасці, развіцця тавараабароту і штогадовых маштабных дзён культуры.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# Выраблена паліва для другога рэактара АЭС

**Партыя ядзернага паліва са 152 цеплавыдзяляльных зборак для рэактара ВВЭР-1200 Беларускай атамнай электрастанцыі прайшла інспекцыйную праверку на Новасібірскім заводзе хімканцэнтратаў (НЗХК).**

У працэдуры выхаднога кантролю прадукцыі ўдзельнічалі прадстаўнікі заказчыка — кампаніі Расатама «ТВЭЛ», ліцэнзаванай кампаніі па прыёмцы ядзернага паліва «УПА ЗАЭС», Беларускай АЭС і Дзяржатамнагляду Беларусі. Правяраючаму боку прадставілі неабходную дакументацыю, вытворчы працэс на заводзе са шматлікімі этапамі кантролю якасці, працэс упакоўкі прадукцыі ў транспартныя кантэйнеры для перавозкі паліва.

— Паліўны дывізіён Расатама выканаў абавязкі па вытворчасці паліва для першага і другога энергаблокаў Беларускай АЭС дакладна ў тэрмін. У далейшым для вырабу перазагрузак свежага ядзернага паліва можа быць задзейнічаны не толькі НЗХК, але і Машынабудаўнічы завод у Электрасталі, — заўважыў **старшы віцэ-прэзідэнт па вытворчасці кампаніі «ТВЭЛ» Міхаіл ЗАРУБІН.** — Нягледзячы на тое, што ў кожнага прадпрыемства па фабрыкацыі цеплавыдзяляльных зборак у ТВЭЛ свая спецыялізацыя, яны абодва валодаюць кампетэнцыямі па вырабе паліва для ВВЭР-1200. Гэта дазваляе нам своечасова забяспечваць пастаўкі ядзернага паліва на ўсе АЭС, якія дзейнічаюць і толькі ствараюцца, з найбольш сучаснымі і эфектыўнымі энергаблокамі пакалення 3+.

У лістападзе 2018 года на новасібірскім прадпрыемстве быў праведзены аналагічны выхадны кантроль пачатковай загрузкі паліва для энергаблока № 1 Беларускай АЭС.

**Ірына СІДАРОК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Тэрэза Мэй пагадзілася на галасаванне аб новым рэферэндуме па «брэксіце»

Прэм'ер-міністр Брытаніі Тэрэза Мэй аб'явіла, што згодная правесці ў Палаце абшчын галасаванне аб другім рэферэндуме па «брэксіце». Гэта — адна з саступак, пры дапамозе якіх прэм'ер спадзяецца ўсё ж такі правесці праз парламент тройчы адхіленае пагадненне аб выхадзе з Еўрасаюза.

Прэм'ер-міністр Тэрэза Мэй учора абвясціла, што яе кабінет гатовы пайсці на пэўныя кампрамісы, каб пераканаць дэпутатаў усё ж такі прагаласаваць за праект пагаднення аб выхадзе, і адзін з гэтых кампрамісаў — галасаванне па пытанні аб тым, праводзіць ці не праводзіць новы рэферэндум.

Прэм'ер-міністр мае намер распачаць чацвёртую спробу правесці праз парламент праект пагаднення аб выхадзе з ЕС у першым тыдні чэрвеня. Пасля гэтага Мэй абяцае, незалежна ад выніку галасавання, паведаміць аднапартыйцам, калі яна сыдзе ў адстаўку. Мяркуецца, што Мэй пакіне пасады кіраўніка кансерватыўнай партыі і прэм'ер-міністра на працягу лета.

### Парубій заявіў, што роспуск Рады аспрэчаць у Канстытуцыйным судзе

Спікер Вярхоўнай рады Андрэй Парубій заявіў, што ўказ прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага аб роспуску парламента будзе абскарджаны ў Канстытуцыйным судзе.

«Сумна і трывожна, што гарант канстытуцыі Украіны прэзідэнт Уладзімір Зяленскі пачынае сваю дзейнасць на пасадзе з грубага парушэння канстытуцыі. Дрэнны знак», — напісаў Парубій у «Фэйсбуку».

У каментарыях да гэтага поста спікер Рады заявіў, што ўказ «будзе аспрэчаны».

20 мая адбылася інаўгурацыя прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага, дзе ён анансаваў роспуск парламента. На наступны дзень ён падпісаў адпаведны ўказ аб датэрміновым спыненні работы Вярхоўнай рады цяперашняга склікання і прызначыў пазачарговыя парламенцкія выбары на 21 ліпеня.

### Расійскія матэматыкі: Зямлі пагражае глабальнае пахаладанне



Апошнія дзесяцігоддзі на Зямлі няўмольна расце тэмпература паветра, растаюць антарктычныя і арктычныя льды, пад пагрозай затаплення знаходзяцца астраўныя і мацерыковыя прыбярэжныя тэрыторыі.

Адны рэгіёны пакутуюць ад небывалай засухі, іншыя ад катастрафічных паводак і апоўзняў, выкліканых пралівымі даждажамі. Вучоныя і палітыкі на міжнародным узроўні прадпрымаюць намаганні, каб хоць неяк затармазіць глабальнае пацяпленне, абумоўленае дзейнасцю чалавека. Але, верагодна, на самай справе сучасныя кліматычныя працэсы нашмат больш складаныя, чым лічыцца.

Група даследчыкаў-матэматыкаў Уральскага федэральнага ўніверсітэта, якая распрацоўвае матэматычныя мадэлі змены клімату, прыйшла да высновы, што сучасныя прыкметы глабальнага пацяплення сведчаць аб рэзкім глабальным пахаладанні ў будучыні, паведамляе сайт універсітэта.

Будучае пахаладанне тлумачыцца зменамі ў Сусветным акіяне. Вялікі прыток прэснай вады ў акіян з-за раставання лёду парушае цыркуляцыі праз меншую шчыльнасць талай вады ў параўнанні з салёнай марской. Гэта прыводзіць да памяншэння паверхневых патокаў цёплай вады ад экватара да полюсаў і, у прыватнасці, да зніжэння інтэнсіўнасці Гальфстрыма, што на сёння зафіксавана эксперыментальна. Аслабленне Гальфстрыма можа прывесці да пахаладання ў Паўночнай Амерыцы і Еўропе, а затым і да глабальнага пахаладання.

Парламенцкі дзённік

# БАНКІ НА ШЛЯХУ ДА АНЛАЙНУ

## Фінансавы сектар Беларусі чакае глыбокая трансфармацыя

**Парламентарыі пазнаёміліся з новымі падыходамі ў развіцці лічбавых банкаўскіх тэхналогій і новымі тэхналогіямі пры аказанні банкаўскіх паслуг. Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах правяла выязное пасяджэнне ў Белзнешэканамбанку, падчас якога ўдзельнікі сустрэчы пазнаёміліся з функцыянаваннем тэхналогій сістэмы дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання, абмеркавалі праблемы сучаснай стратэгіі кіравання адносінамі з кліентамі, пытанні развіцця, прасоўвання і бяспекі дыстанцыйных прадуктаў.**

«У краіне хутка развіваецца сектар ІТ-індустрыі, дзякуючы чаму ў беларускім рознічным бізнесе банкаў з'яўляецца ўсё больш лічбавых прадуктаў і сэрвісаў для забеспячэння патрэб кліентаў», — падкрэсліла **старшыня камісіі Людміла ДАБРЫНІНА.** Так, банк, які наведалі дэпутаты, прапануе амаль усе класічныя банкаўскія паслугі дыстанцыйна, пашыраючы лінейку анлайн-прадуктаў.

З пункту гледжання **старшыні праўлення ААТ «Банк БелВЭБ» Васіля МАЦЮШЭЎСКАГА,** адзін з важных, але недастатковых рэсурсаў — кампетэнтныя кадры: «Класічны банкаўскі бізнес сыходзіць у нябыт, час фарміруе ўжо зусім іншы попыт на тэхналогіі, якасць, паслугі».

Як адзначыла Людміла Дабрыніна, на выязным пасяджэнні дэпутаты атрымалі неабходную інфармацыю для далейшага ўдасканалення банкаўскага заканадаўства.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Праект

# СВЯТА БУДАЎНІЧАЙ ТЭХНІКІ

## Спаборніцтвы Клуба аператараў плюс экатэатр

**Кампанія «СпецЕўраТэх», эксклюзіўны дылер Volvo ў нашай краіне, аб'яўляе пра старт новага праекта: з 1 чэрвеня ў Мінску ў Верхнім горадзе пройдуць першыя спаборніцтвы Клуба аператараў будаўнічай тэхнікі.**

Дарэчы, у Еўропе такія спаборніцтвы праходзяць ужо больш за 20 гадоў. Сёння Еўрапейскі Клуб аператараў налічвае больш за 27 тысяч удзельнікаў з 16 краін свету, і з кожным годам геаграфія яго пашыраецца. Ужо ў пачатку чэрвеня айчынныя аператары ўпершыню змогуць пазмагацца на нацыянальным этапе за пуцёўкі ў Еўрапейскі гранд-фінал Operators Club, які сёлета пройдзе ў шведскім горадзе Эскільстун.

Паядынкі Клуба аператараў вядомыя сваімі няпростымі выпрабаваннямі, дзе пераможцам становіцца той спецыяліст, які за мінімальны час выканае ўсе заданні без памылак. Два аператары, якія пакажуць найлепшы час па выніках правядзення двух этапаў, стануць фіналістамі ў Беларусі і будуць прадстаўляць нашу краіну ў фінале ў Швецыі.

Стаць членам Клуба і прыняць удзел у спаборніцтвах можа практычна кожны аператар, незалежна ад таго, на тэхніцы якога вытворцы ён працуе. Для гэтага неабходна запоўніць анкету на стойцы рэгістрацыі, а таксама прад'явіць дзеючае пасведчанне трактарыста-машыніста дзяржаўнага ўзору, якое пацвярджае наяўнасць права кіравання дарожна-будаўнічай тэхнікай. Пры ўступленні ў Клуб аператараў удзельнік атрымлівае картку члена, якая дае яму розныя перавагі, такія як прывітальны падарунак, атрыманне запрашэнняў на выстаўкі спецтэхнікі і, вядома, магчымасць змагацца за тытул чэмпіёна Еўропы.

Першынство аператараў пройдзе ў першую суботу чэрвеня ў самым сэрцы Мінска ў рамках святкавання Дня Швецыі — 2019, арганізатарамі якога з'яўляюцца пасольства Швецыі ў нашай краіне і Мінгарвыканкам. Гасцей свята чакае незабыўнае выступленне пераможцы «Еўрабачання-2012» — Ларын. У праграме Дня Швецыі — выступленне шведскага хору, шведскія хіты ў выкананні кавер-бэнда Пятра Клюева і гастратэатр. Тут жа будзе разгорнуты шведскі экадворык, у якім можна будзе даведацца, што такое экафіка, паўдзельнічаць у майстар-класе па сартаванні смецця і ўбачыць выступ экатэатра. У гэты дзень арганізуюць шведскі квэст, таксама ўсе ахвотныя змогуць паўдзельнічаць у конкурсе «на Дзень Швецыі надзень Швецыю» (на свята прапануецца прыйсці ў нацыянальных касцюмах або адзенні колераў шведскай сімволікі).

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Гэта трагедыя павінна застацца ў мінулым стагоддзі

**Сёння стартуе XIV Беларускі міжнародны медыяфорум «Партнёрства ў імя будучыні: журналістыка і сацыяльная абарона грамадства». Учора замежныя госці форуму наведалі Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Падчас экскурсіі яны пазнаёміліся з экспазіцыямі і калекцыямі музея, згадалі імёны герояў, больш даведаліся пра трагедыі, якія адбываліся на нашай зямлі.**



Фота БелТА.

— Мы ведаем, што самы спусташальны ўдар атрымала ў першую чаргу беларуская зямля. За гады Вялікай Айчыннай вайны беларускі народ страціў каля трох мільёнаў жыхароў — амаль трэць насельніцтва краіны. Гэта вялікае гора. Гляджу рарытэты гэтага новага музея, мадэрнізаванага па ініцыятыве Прэзідэнта Беларусі, і адчуваю боль тых людзей, — дзяліўся ўражаннямі падчас экскурсіі **карэспандэнт Азербайджанскага дзяржаўнага інфармацыйнага агенцтва «Азертадж» Азіз МАМЕДАЎ.** — У нас агульная гісторыя, мы абавязаны разам расказваць пра мужнасць савецкага народа. Загінулі мільёны людзей! Кожны народ нёс страты. Азербайджан накіраваў на вайну каля 700 тысяч сваіх сыноў, палова з якіх не вярнулася. Я даведаўся, што кожны год сюды прыносяць да 700—800 рарытэтаў, а гэта азначае, што людзі разумеюць — памяць пра вайну неабходна перадаваць маладому пакаленню, каб пазбегнуць паўтарэння такіх падзей. Гэта трагедыя павінна застацца ў XX стагоддзі, не перайсці ў XXI.

— Сёння ва ўсіх краінах вядзецца маштабная падрыхтоўка да святкавання 75-годдзя Вялікай Перамогі. Дзякуючы знаёмству з музеем мы ўбачылі, якая цяжкая была вайна і як увесь савецкі народ змагаўся супраць захопнікаў. Да абароны Беларусі прычыніліся і нашы землякі. І мы ўдзячны беларускаму народу, які захоўвае памяць пра гэта — у Мінску стаіць помнік Герою Савецкага Саюза Джумашу Асаналіеву, што загінуў падчас вызвалення Беларусі, — заўважыў **Абдыкадыр СУЛТАНБАЕЎ, старшыня Саюза журналістаў Кыргызскай рэспублікі.**

Госці падзяліліся сваімі меркаваннямі, як сёння трэба працаваць з ваеннай тэматыкай. Так, **венгерскі журналіст Габар ШЦІР,** які піша артыкулы для штотыднёвікаў «Венгерскі голас», «Дэмакрата» і для партала «Плошча Масквы», заўважыў, што самае галоўнае пра вайну людзі ўжо ведаюць, сведкі ўсё, што маглі, расказалі, надыходзіць час гісторыкаў, калі на аснове інфармацыі многае можна рэканструяваць. Важна толькі не скажаць звесткі, захаваць аб'ектыўныя падыходы да тэмы, не палітызаваць, бо сёння некаторыя заходнія сродкі масавай інфармацыі робяць памылкі, змяншаюць ролю і гераізм савецкага народа, і, на жаль, часта гэта адбываецца з прычыны таго, што адносіны паміж Расіяй і Захадам сталі больш «халоднымі». Таксама Габар падзяліўся тым, якія б тэмы хацеў пабачыць абмеркаванымі на медыяфоруме. Так, ён жадае даведацца, як калегі глядзяць на будучыню друкаваных СМІ, як можна мадэрнізаваць прафесію. Ён упэўнены, што новыя тэхналогіі, тыя ж «разумныя тэлефоны», не паўплываюць на сутнасць журналістыкі. СМІ будуць запатрабаванымі, роля журналістаў застанецца ранейшай — збіраць і фільтраваць звесткі, бо, з аднаго боку, інфармацыі пра тое, што адбываецца ў свеце, становіцца ўсё больш, а з іншага — складваецца ўражанне, што чалавек ведае не так шмат, таму што часу для адбору фактаў не хапае.

**Тацццяна КУЗНЯЦОВА, дэкан факультэта журналістыкі Нацыянальнага ўніверсітэта «Адэская юрыдычная акадэмія»,** заўважыла, што сёння робяцца вядомымі новыя старонкі гісторыі, якія трэба вывучаць. «Вайна — рана, якая баліць усім, хто меў да яе дачыненне. Але мы бачым, як мяняецца ход гісторыі і як па-рознаму інфармацыя інтэрпрэтуецца. Я лічу, што нельга спекуляваць гэтай тэмай, правакаваць людзей на канфлікты, трэба навучыцца ўспрымаць рэальнасць і новыя факты правільна». Яна заўважыла, што адна з важных тэм, якая будзе абмяркоўвацца на медыяфоруме, — праблема адрознення фэйкавых навін. Змагацца з ёй, на яе думку, можна двума шляхамі — па-першае, павышаць медыяпісьменнасць, вучыць людзей думаць, аналізаваць і самастойна вырашаць, дзе сапраўдныя навіны, а дзе фэйк, а, па-другое, СМІ павінны адпавядаць стандартам журналістыкі, ствараць якасную інфармацыю і працаваць на імідж і давер чытачоў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# «Місія міласэрнасці»: старыя паштоўкі — пра Чырвоны Крыж

**Добра знаёмая кніжная серыя «У пошуках страчанага», у якой ужо выдадзена нямала выданняў з рэпрадукцыямі старых паштовак, папоўнілася альбомам «Місія міласэрнасці: ілюстрацыйная гісторыя Чырвонага Крыжа ў Беларусі».**




Лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» філакартыст і гісторык Уладзімір Ліхадзедаў з дапамогай артэфактаў са сваёй уласнай калекцыі расказвае пра рух Беларускага Чырвонага Крыжа. Матэрыялы са збораў уважлівага да даўніны руплівіцы ўзнаўляюць дзейнасць грамадскага аб'яднання на тэрыторыі сучаснай Беларусі з пачатку XX стагоддзя да 1939 года. Некаторыя рэпрадукцыі дазваляюць зазірнуць і ў ранейшыя часіны, у дзевятнаццатае стагоддзе. Вось што піша ва ўступным слове да кнігі **Генеральны сакратар Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Вольга МЫЧКО:** «У кнізе вядомага гісторыка Уладзіміра Ліхадзедава... прадстаўлены ўнікальныя фотаздымкі і паштоўкі з яго калекцыі, якія паказваюць работу нашай арганізацыі на тэрыторыі сучаснай Беларусі з 1867 г., калі было створана Расійскае таварыства апекі аб параненых і хворых воінах. 26 сакавіка 1872 г. утварылася першае Мінскае мясцовае ўпраўленне, а ў 1877 г. на тэрыторыі цяперашняй Беларусі налічвалася ўжо 5 мясцовых упраўленняў, 30 крапасных і павятовых камітэтаў, якія аб'ядноўвалі ў сваіх шэрагах больш за 3000 чалавек...»

Відавочна, што дзякуючы кнізе У. Ліхадзедава можна здзейсніць адмысловае падарожжа па Беларусі, убачыць «адрасы міласэрнасці», разгледзець вобразы і постаці людзей, якія не шкадавалі ні сваіх сіл, ні сардэчных перажыванняў дзеля іншых — дзеля тых, каму найболей была патрэбна дапамога. Такія вывы, такія кнігі — добры ўрок выхавання міласэрнасці, чулласці, душэўнасці.

Выдатна было б у знак 70-годдзя падпісання Жэнеўскіх канвенцый 1949 года, якія з'яўляюцца асновай міжнароднага гуманітарнага права і складаюцца з найбольш важных прававых норм, што абмяжоўваюць праявы жорсткасці падчас узброеных канфліктаў, правесці па краіне, а мо і за яе межамі, і кнігу «Місія міласэрнасці», і самі паштоўкі, старыя фотаздымкі. Прэзентацыя ці выстаўка такога характару сталася б добрым складнікам сур'ёзнай выхаваўчай работы ў грамадстве. Кніга-альбом Уладзіміра Ліхадзедава пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда» па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Будзь у курсе!

# АПЛАТА ПРАЕЗДУ — БАНКАЎСКАЙ КАРТКАЙ

**З 23 мая праводзіцца тэставая эксплуатацыя сэрвісу аплаты паездак на грамадскім транспарце з выкарыстаннем бесканактавай банкаўскай карткі (VISA, Mastercard, БелКарт-Maestro з бесканактавым інтэрфейсам) або мабільнай прылады (смартфона, бірулькі, гадзінніка і інш.) з падтрымкай тэхналогіі бесканактавых плацяжоў NFC на валідатарах сталічнага трамвайнага маршруту № 6 «ДС «Серабранка» — ДС «Зялёны Луг».**

Інфармацыйная падтрымка і кансультацыі карыстальнікаў сэрвісу па тэлефоне кантакт-цэнтра +375 17 217-39-50.

Кошт адной паездкі — 60 капеек. Пры праверцы аплаты праезду неабходна прыкласці сваю бескантактную банкаўскую картку або мабільную прыладу да тэрмінала кантралёра. Тэрмінал адлюструе кантралёру факт аплаты праезду.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# НАРЭШЦЕ ЗНАЙШЛІ СУПАКОЙ

## У Брэсце перапахавалі астанкі 1214 вязняў гета, расстраляных нацыстамі

**На Паўночных могілках Брэста адбылася жалобная ўрачыстая цырымонія пахавання астанкаў людзей, якія былі знойдзены пры будаўніцтве «Прыбужскага квартала».**

Першыя косткі будаўнікі падняў у студзені гэтага года, калі прыступілі да капання катлавана. Потым на месца прыбылі байцы спецыяльнага батальёна Міністэрства абароны і штодзень даставалі з зямлі да 40 астанкаў жанчын, мужчын, дзяцей. Наша газета падрабязна расказвала пра падзеі ў нумары за 21 сакавіка.

На цырымонію пахавання прыехалі прадстаўнікі дыпламатычных місій Расіі, Украіны, Польшчы, ЗША, Аўстрыі, Венгрыі, Германіі, Ісландыі, Казахстана, Чэхіі, Славакіі і іншых краін. Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Ізраіля ў Беларусі Алон Шогам падзякаваў кіраўніцтву Брэста за годнае стаўленне да памяці, за магчымасць правесці цырымонію пахавання па яўрэйскай традыцыі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**


**Извещение о проведении электронных торгов**

**Организатор аукциона:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 4б.

**Продавец:** КПДУП «Слуцкое управление производственно-технологической комплектации», Минская обл., г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, д. 5.

**Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 4б.

| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by | | |
|---|---|---|---|
| **Предмет электронных торгов Местоположение: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, д. 5** | | | |
| № лота | Наименование | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Шаг аукциона, без НДС, бел. руб. |
| 1 | Автомобиль грузовой бортовой УАЗ 452 Д (рег. знак АЕ 6997-5) | 1 400,00 | 70,00 |
| 2 | Полуприцеп цистерна ТЦ 13 (рег. знак А 4427 А-5), инв. номер 772 | 1 600,00 | 80,00 |
| 3 | Автокран МАЗ 5334 (рег. знак АВ 4532-5), инв. № 1386 | 6 600,00 | 330,00 |
| 4 | Грузовой специальный самосвал МАЗ 5551 А2-325 (рег. знак АЕ 6744-5), инв. № 1530 | 4 700,00 | 235,00 |
| 5 | Прицеп МАЗ 857100 010 (рег. знак А 4554 А-5), инв. номер 1531 | 2 900,00 | 145,00 |
| 6 | Седельный тягач MAZ 6422 A5-320 (рег. знак АЕ 6800-5), инв. номер 1533 | 10 100,00 | 505,00 |
| 7 | Грузовой специальный сортиментовоз МАЗ 6303 А8-328 (рег. знак АЕ 6897-5), инв. номер 1543 | 12 500,00 | 625,00 |
| 8 | Грузовой специальный самосвал MAZ 5516 A5-375 (рег. знак AI 8155-5), инв. номер 5041 | 12 300,00 | 615,00 |
| 9 | Прицеп МАЗ 8561 00-014 (рег. знак А 4600 А-5), инв. номер 1547 | 5 700,00 | 285,00 |
| 10 | Автомобиль GAZ-31105 (рег. знак 1515 ЕК-5), инв. номер 1564 | 1 400,00 | 70,00 |
| 11 | Полуприцеп Interconsult STF3-32CA (рег. знак А 0691 В-5), инв. номер 1668 | 6 600,00 | 330,00 |
| 12 | Грузовой специальный самосвал MAZ 5516 A5 (рег. знак АЕ 6896-5), инв. номер 1544 | 12 300,00 | 615,00 |
| 13 | Щетка дорожная НО-86 (зав. № 1630) | 570,00 | 28,50 |
| 14 | Вагон бытовка, инв. номер 295 | 2 600,00 | 130,00 |
| 15 | Дом вагон, инв. номер 299 | 2 700,00 | 135,00 |
| 16 | Станок СТД-9А, инв. номер 437 | 4 600,00 | 230,00 |

**Порядок ознакомления** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 15.00, Шкурский Александр Владимирович, 8-029-691-36-99.

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| **Срок подписания договора купли-продажи** | 10 (десять) рабочих дней после электронных торгов |
|---|---|

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.

**Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов.**

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия.

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 25.06.2019 в 11.00,** каждый следующий лот с интервалом 10 минут, на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by).

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): 24.06.2019 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by).**

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.**
**E-mail: auction@cpo.by**

# КУДЫ ВЕЛАДАРОЖКА ПРЫВЯДЗЕ

## Навыперадкі з машынамі

Здаецца, зусім нядаўна ў сталіцы востра стаяла пытанне веладарожак. Тратуары ў цэнтры горада распаласавалі белым колерам і «ўпрыгожылі» піктаграмамі ровараў. Катайцеся на здароўе. Большасць аматараў пакруціць педалі змены сапраўды ацаніла. А вось некаторым адведзенае месца падалося цеснаватым. Усё часцей у інтэрнэце пачалі з'яўляцца фота і відэа, на якіх веласіпедысты-экстрэмалы то рассякаюць пасярод МКАДа, то «гуляюць у шашачкі» з машынамі, а то і ўвогуле «вучаць розуму» аўтамабілістаў. Пры гэтым значная частка гісторый заканчваецца трагічна.

Як паведамляе прэс-служба ўпраўлення ДАІ Міністэрства ўнутраных спраў, са студзеня па красавік 2019 года на дарогах Беларусі адбылося 47 наездаў на веласіпедыстаў. Па віне самых уладальнікаў двухколавага транспарту здарылася 17 ДТЗ, у якіх загінуў адзін чалавек і 16 атрымалі траўмы. У сямі выпадках веласіпедысты знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. Але ж гэта статыстыка «несезону». Летам, на жаль, лічбы павялічваюцца ў разы.

Супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі нагадваюць, што веласіпедысты павінны быць куды больш уважлівыя і асцярожныя, чым іншыя ўдзельнікі дарожнага руху. Уменне прадбачыць небяспеку і прагназаваць аварыйныя сітуацыі засцерагуць ад бяды. Аднак і кіроўцы аўтамабіляў павінны прызнаць, што веласіпед — паўнавартасны транспарт, якому ў пэўных выпадках у адпаведнасці з заканадаўствам дазваляецца рухацца па праезнай частцы. Галоўная задача кіроўцаў — быць уважлівымі пры перастройваннях, манеўрах і іншых дзеяннях, якія могуць прывесці да сутыкненняў з двухколавымі транспартнымі сродкамі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Безумоўна, рызыка трапіць у ДТЗ ёсць заўсёды. Як паказвае практыка, нават у тых веласіпедыстаў, якія не парушаюць правілы. Паўгода таму ў Астравецкім раёне мужчыну на веласіпедзе насмерць збіў Volkswagen. Пры тым што той максімальна паклапаціўся аб бяспецы: апрануў камізэльку павышанай бачнасці са святлоадбівальнымі элементамі, на галаве быў уключаны электрычны ліхтарык, ровар быў увешаны рознакаляровымі катафотамі. Жанчына за рулём яго «проста не заўважыла ў святле фар машыны, якая ехала па сустрэчнай паласе».

З другога боку, нярэдкімі сталі выпадкі, калі веласіпедысты на вялікай хуткасці «ўязджаюць» у аўтамабілі. Зразумела, самі ў падобных ДТЗ могуць пацярпець. У 2015-м, напрыклад, жыхар Нясвіжа на веласіпедзе ўдарыўся аб раптоўна адчыненыя дзверы машыны і памёр на месцы ад цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Разам з тым з заявамі ў міліцыю ў апошнія гады пачалі звяртацца пацярпелыя ўладальнікі аўто. Ліхачы на двух колах не проста пакідаюць драпіны на машынах, а мнуць капоты, разбіваюць фары і зносяць люстэркі задняга бачання. Не дзіўна, улічваючы, што некаторыя сучасныя веласіпеды могуць развіваць хуткасць да 30 кіламетраў у гадзіну.

Веласіпедысты патрабуюць прызнаваць сябе раўнапраўнымі ўдзельнікамі дарожнага руху, але прытрымлівацца яго правіл (а часам нават азнаёміцца з імі) не жадаюць. Рэгулярныя рэйды супрацоўнікаў праваахоўных органаў толькі пацвярджаюць гэта. Але ці павінны веласіпедысты іх ведаць? Экзамен на кіраванне яны не здаюць, правы кіроўцы для іх не прадугледжаны, двухколавыя машыны не нумаруюцца. Каюся, я і сама з правіламі, якія датычацца веласіпедыстаў, азнаёмілася толькі пры падрыхтоўцы гэтага матэрыялу. Хоць езджу на веласіпедзе з дзесяці гадоў.

## Ведай сваё месца

Калі ў сутыкненнях ровараў і машын ёсць каму разбірацца (гэтым займаецца ДАІ), то праблемы кшталту пешаход-веласіпедыст фактычна нікім не рэгулююцца. ДТЗ лічацца толькі здарэнні, якія адбыліся з удзелам хоць бы аднаго механічнага транспартнага сродку ў руху і ў выніку якіх нанесеная шкода здароўю, жыццю ці маёмасці. Але градус і колькасць канфліктаў на тратуарах з кожным годам павялічваюцца. Успомнім рэзанансную гісторыю, калі сталічны веласіпедыст наехаў на веладарожцы на хлопца, а пасля яшчэ і ўдарыў яго некалькі разоў бейсбольнай бітай. Вынік — хуліган адправіўся ў турму на сем гадоў.

Калі раней веласіпедысты ўспрымаліся выключна мірнымі ўдзельнікамі руху, то цяпер на іх пазіраюць з некаторым недаверам. Я і сама пераходжу веладарожку толькі пасля таго, як запэўнюся, што па ёй ніхто не нясецца. Баязлівая? Няхай. Вось толькі асцярожнасць узнікла не на роўным месцы. Ведаю некалькі гісторый, у якіх бяскрыўдныя на першы погляд сутыкненні заканчваліся адкрытымі пераломамі і разборкамі ў судзе. Трапіць у падобную сітуацыю зусім не хочацца.

Чаму ўзнікаюць такія дзікія (інакш не скажаш) сітуацыі? Праз няўважлівасць? Магчыма. Калі шчыра, пешаходы ўсё яшчэ не прызвычаіліся да таго, што ў іх адабралі частку тратуара. Звычкі не фарміруюцца хутка. Праз нежаданне саступіць? Яшчэ больш верагодна. Але даказваць з пенай у роце свае правы на кавалачак зямлі, пакрыты пліткай, і тыкаць на іншых са словамі «сам вінаваты» — бессэнсоўна. Асабліва калі ў здарэнні ёсць пацярпелыя.

Бяда яшчэ і ў тым, што абодва бакі часта не жадаюць чуць адно аднаго не толькі ў пераносным, але і прамым сэнсе. Навушнікі — рэч, з якой прыемна, але вельмі небяспечна выходзіць/выязджаць на тратуар у наш час. Калі ў вушах пешахода «корак», то веласіпедыст можа званіць колькі заўгодна — яго ўсё роўна не пачуюць. Атрымліваецца, такая важная ўмова бяспекі, як званочак, у наш час страціла сваю актуальнасць.

Нават самі актывісты веларуху Беларусі прызнаюць праблему і імкнуцца яе вырашыць. Нездарма на сайце Мінскага ровараннага таварыства змешчаны «20 парад ветлівай язды» для сваіх. Накшталт «Веладарожка прызначаная для веласіпедыстаў. Тратуар — для пешаходаў. На тратуары веласіпедыст — госць», або: «Пешаходу на веладарожцы пазвані ў званочак. Падзякуй яму, калі ён саступіць дарогу [...] Калі табе сустрэўся пешаход, які прынцыпова не саступае, — аб'едзь збоку. Лепшы настаўнік — не ты, а твая ветлівасць». Слушна.

Аднак нават пры такім раскладзе бяспека — гэта задача не толькі ўладальнікаў веласіпедаў. На працягу месяца я назірала за пешаходамі. Сапраўды, многія пакуль ніяк не могуць звыкнуцца з тым, што яны не адзіныя на тратуарах. Па старой памяці шпацыруюць не па сваёй тэрыторыі. Але самая вялікая праблема — пешаходныя пераходы са спецыяльнай разметкай. За чатыры тыдні не было ні разу, каб, пераходзячы, народ ішоў толькі па сваёй шырокай паласе, не заступаючы на вузенькую веласіпедную. Ёсць над чым працаваць.

## Перамены ўжо блізка

У сярэдзіне красавіка ўсіх ускалыхнула навіна пра змены ў правілах дарожнага руху. Асобныя пункты ў іх датычацца і веласіпедыстаў. ДАІ прапаноўвае дазволіць праезд на роварах па рэгуляваных пешаходных пераходах (пакуль так рабіць нельга!). Такім чынам, там, дзе ёсць святлафор, спешвацца будзе не трэба. Але пры пад'ездзе да перахода веласіпедыст павінен будзе зніжаць хуткасць. Пакуль нававядзенні толькі абмяркоўваюцца. На Прававым форуме Беларусі (forumpravo.by) разгарнулася гарачая дыскусія на тэму прапанаваных змен. За два тыдні не абыякавыя да праблем на дарогах і тратуарах грамадзяне выказаліся аж на 164 старонкі! Пункт пра веласіпедыстаў народ падтрымлівае, бо ўжо даўно ніхто на святлафорах не спешваецца. ДАІ фактычна мяняе правілы ў адпаведнасці з тым, што ўжо адбываецца на дарогах. Правільна гэта ці не — пытанне адкрытае. Толькі днямі ў сталіцы здарылася чарговае ДТЗ менавіта на пешаходным пераходзе. На праспекце Незалежнасці каля Нацыянальнай бібліятэкі аўтамабіль наехаў на веласіпедыстку з дзіцем. Яна думала, што паспее праскочыць у апошнія секунды перад тым, як для машын загарыцца зялёны. Не паспела. Вынік — трапіла пад колы і ў бальніцу. А магла б спешыцца, пачакаць хвілінку і спакойна перайсці дарогу. Але часу думаць не было — веласіпед імчаў наперад...

**Ганна КУРАК.**

## Даведка

● **У адпаведнасці з главой 20 Правілаў дарожнага руху Рэспублікі Беларусь, рух на веласіпедзе павінны ажыццяўляцца па веладарожцы, а пры яе адсутнасці — па абочыне, тратуары або пешаходнай дарожцы. Важная акалічнасць — веласіпедыст пры гэтым «не павінен ствараць перашкод для бяспечнага руху пешаходаў». Толькі пры адсутнасці пазначаных элементаў дарогі або немагчымасці руху па іх можна выехаць на праезную частку, але ў адзін рад і не далей 1 метра ад яе правага боку.**

● **У цёмны час сутак на веласіпедзе павінны быць уключаны: спераду — белая фара (ліхтар), ззаду — чырвоная.**

● **Пры перасячэнні праезнай часткі па пешаходным пераходзе веласіпедыст павінен спешыцца і весці ровар побач з сабой.**

● **Забаронена рухацца не трымаючыся за руль і прыбраўшы ногі з педаляў.**

● **Таксама нельга перавозіць пасажыраў, за выключэннем дзяцей на спецыяльна абсталяваным сядзенні.**

Парушэнне правілаў караецца штрафам ад адной да трох базавых велічынь. Калі вас зловяць, а вы будзеце яшчэ і ў алкагольным ап'яненні, то сума можа вырасці да 5 базавых. Калі ў выніку парушэння ўзнікне аварыйная сітуацыя, давядзецца заплаціць ад 5 да 8 базавых. Да 20 базавых велічынь могуць спагнаць у выпадках, калі прычынены цялесныя пашкоджанні і пашкоджанні іншым транспартным сродкам.

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в населенных пунктах Каменского сельсовета Лепельского района Витебской области**

**Организатор: Каменский сельский исполнительный комитет**

| Лот | Месторасположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер | Целевое назначение земельного участка | Условия и ограничения | Расходы по подготовке и изготовлению документации, рублей | Начальная цена, рублей | Сумма задатка, рублей (10 %) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Витебская область, Лепельский район, Каменский с/с, д. Поречье, ул. Центральная, У-2А, площадь 0,1418 га, кадастровый номер 222781712101000040 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код 1 09 02, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним, квартиры в блокированном жилом доме), без изменения целевого назначения | 1.Природные территории, подлежащие специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема) озеро Девичье, площадь – 0,1418 га 2. Придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги, площадь – 0,1289 га | 1801,86 | 2500,00 | 250,00 |
| 2. | Витебская область, Лепельский район, Каменский с/с, д. Поречье, ул. Центральная, У-2Б, площадь 0,1507 га, кадастровый номер 222781712101000039 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код 1 09 02, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним, квартиры в блокированном жилом доме), без изменения целевого назначения | 1. Водоохранные зоны рек и водоемов (озеро Девичье), площадь – 0,1507 га | 1816,72 | 2500,00 | 250,00 |
| 3. | Витебская область, Лепельский район, Каменский с/с, д. Бор, ул. Озерная, У-38А, площадь 0,1450 га, кадастровый номер 222781701601000153 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код 1 09 02, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним, квартиры в блокированном жилом доме), без изменения целевого назначения | 1.Водоохранные зоны рек и водоемов (озеро Неколочь), площадь – 0,1450 га 2. Охранные зоны электрических сетей (напряжением до 1000В), площадь 0,0003 га | 1875,11 | 2500,00 | 250,00 |

1. **Аукцион состоится 27 июня 2019 года в 15.00 по адресу:** Витебская область, Лепельский район, агрогородок Камень, улица Ленинградская, 25а.

2. Аукцион проводится в соответствии с Положением, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667».

3. Заявления от граждан Республики Беларусь на участие в торгах принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, аг. Камень, ул. Ленинградская, 25а, Каменский сельский исполнительный комитет. **Последний день приема заявлений – 21 июня 2019 года до 17.00.**

4. Для участия в аукционе гражданину необходимо предоставить копию документа, содержащего его идентификационные сведения (без нотариального засвидетельствования); представителю гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, и копии платежных документов, подтверждающих уплату задатка.

Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на расчетный счет BY89AKBB36003190600650000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, БИК банка AKBBBY2X, УНП 300594330 (УНП 300039758). **Получатель – Главное управление Министерства финансов Республики Беларусь (Каменский сельский исполнительный комитет).**

5. Не допускается начало торгов и продажа земельного участка по начальной цене.

6. Аукцион по лоту состоится при наличии не менее двух участников.

7. В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, расходы на публикацию в средствах массовой информации, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

8. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с земельно-кадастровой документацией и земельным участком на местности.

9. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: строительство инженерных коммуникаций будет осуществлено в соответствии с проектно-сметной документацией.

**Контактные телефоны: 8 (02132) 6-99-62; 8 (029) 713-99-41**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
23 МАЯ 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 9 (15864)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Аляксандра ГЕРАСІМЕНЯ:

# «У кожнага свой рэцэпт поспеху»



**Двухразовая віцэ-чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў 2012 года, бронзавая прызёрка Алімпійскіх гульняў 2016 года, уладальніца залатых узнагарод чэмпіянатаў свету і Еўропы... Спіс яе дасягненняў можна працягваць доўга. Аляксандра Герасіменя — сапраўдны баец, а яшчэ — клапатлівая маці і жонка. І проста працавіты чалавек, які не ведае перашкод.**

**— Адкуль у вас з'явілася любоў да вады?**

— Думаю, з самага дзяцінства. З яе мяне было проста не дастаць. Рэчка, вадаём, канаўка — я лезла куды заўгодна. *(Смяецца.)* А калі выпадкова трапіла ў басейн, адразу зразумела, што гэта тое месца, дзе мне па-сапраўднаму добра.

**— Памятаеце свае першыя поспехі?**

— У мяне яны з'явіліся далёка не адразу. Калі прыйшла ў басейн, была адной з тых, хто адставаў. Але, нягледзячы на тое, што не ўсё атрымлівалася, я не прапускала ніводнага занятку, таму што гэта прыносіла мне задавальненне. З часам нарэшце дачакалася таго моманту, калі дагнала іншых, а крыху пазней — нават перагнала. Поспехі пачаліся ў класе шостым-сёмым. Тады я выйграла першы сярэбраны медаль на чэмпіянаце горада. На тыя спаборніцтвы за мяне прыйшоў хварэць мой тата. Для мяне гэта было вельмі важна.

**— На спаборніцтвах заўсёды адчуваецца напружаная абстаноўка?**

— Гледзячы на якіх... Чэмпіянат свету, напрыклад, не можа параўнацца па напружанасці па тым запале, які прысутнічае на Алімпійскіх гульнях. Бо яны — гэта мэта, да якой ідуць усе спартсмены. Складана перадаць атмасферу, якая там пануе, нават усмешкі не заўсёды бываюць шчырымі. Але гэта і зразумела: усе хочуць выйграць і стаць чэмпіёнамі. Напэўна, на любых спаборніцтвах, а асабліва на Алімпіядзе, перамагае той, хто псіхалагічна мацнейшы. Хто маральна падрыхтаваны, у таго больш шанцаў перамагчы.

**— Якім было самае незвычайнае месца, дзе вы плавалі?**

— Шчыра кажучы, не вельмі люблю гэта рабіць у тых месцах, якія не ведаю. Мора, акіян, басейн — вось дзе мяне можна ўбачыць. На рэчцы я ніколі не плаваю. У дзяцінстве калісьці танула, і ў мяне да гэтага часу прысутнічае боязь каламутнай вады. Ды ў прынцыпе ва ўсіх плыўцоў ёсць своеасаблівая фобія: не шмат хто любіць плаваць, калі не бачыць дна.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Я — МАЛАДЫ. І мне не ўсё роўна!..

У ліку найлепшых

# УЗНАГАРОДЫ ЗА РУПЛІВАСЦЬ

**Сёння мы падвядзём вынікі нашага чарговага творчага спаборніцтва сярод маладых пазаштатных аўтараў «Я — малады! І мне не ўсё роўна!..», якое было абвешчана на навучальны сезон 2018—2019 гадоў. Напачатку па традыцыі коратка прааналізуем ход гэтага конкурсу.**

**У адрозненне ад папярэдніх гадоў на яго паступіла менш творчых «проб пяра». Самыя лепшыя (матэрыялы пераможцаў) мы, як і было абяцана згодна з умовамі, публікуем. Магчыма, адыграла ролю тое, што планка нашага адмысловага спаборніцтва (пра што «Чырвонка. Чырвоная змена» пастаянна нагадвала) дастаткова высокая. Конкурс разлічаны найперш на тых маладых аўтараў, якія збіраюцца паступаць на факультэт журналістыкі і ставяцца да гэтага выбару дастаткова сур'ёзна: займаюцца ў гуртках па профілі, выступаюць на алімпіядах, рэгулярна пішуць у розныя выданні, добра валодаюць беларускай мовай. Таму і «проб пяра» ад іх мы заўсёды чакаем адпаведнага ўзроўню. І вельмі прыемна, што сярод нашых намінантаў — менавіта такія (мы ўпэўнены ў гэтым) мэтанакіраваныя дзяўчаты. (Так, каторы год запар сярод канкурсантаў хлопцаў няма, пра што мы таксама неаднойчы згадвалі.)**

**Гэта абсалютна не азначае, што інтарэс да конкурсу, да нашага маладзёжнага дадатку, да самой прафесіі журналіста ў сучаснай моладзі цалкам згас. Якраз наадварот. Штогод у красавіку-маі рэдакцыю літаральна закідваюць электроннымі пісьмамі абітурыенты, якім патрэбны публікацыі для паступлення на факультэт журналістыкі. Яны просяць парады, пытаюцца, пра што лепш напісаць. Але, прабачце, у гэты час, які застаўся да пачатку ўступнай кампаніі, ужо мала што можна змяніць. І ўвогуле, такія звароты даюць падставы меркаваць аб спантаннасці выбару будучай прафесіі выпускнікамі-школьнікамі...**

**А цяпер, уласна, пра вынікі конкурсу. Рэдакцыйнае журы вырашыла: пераможцамі творчага спаборніцтва сталі Дар'я РАЖКО і Алёна КУХАРАВА, лаўрэатамі — Кацярына КВАЧОНАК і Ксенія СІГАЛАВА. Усе яны будуць узнагароджаны дыпломамі «Звязды» і памятнымі прызамі з яе сімволікай. Апроч таго, старэйшыя дзяўчаты атрымаюць рэкамендацыі для паступлення на факультэт журналістыкі. Віншуем!**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Пазнаёміцца з прафесіяй

# УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З ШЫШАК...

## Аповед пра выбар, аповед пра лес

**— Старонніх людзей тут няма. У нашу прафесію прыходзяць толькі тыя, хто па-сапраўднаму любіць прыроду, — лічаць супрацоўнікі Жлобінскага лясгаса. — Па Ірыне адразу было зразумела — яна свой чалавек!**

### Сімволіка выпадковасцяў

«Сваёй» **Ірына РУБАНАВА** стала тры гады таму. Дзяўчына прыехала сюды па размеркаванні:

— Я хацела быць эколагам, але крыху не хапіла прахадных балаў пры паступленні. Так стала студэнткай ГДУ імя Францыска Скарыны біялагічнага факультэта спецыяльнасці «лясная гаспадарка». І, ведаеце, не пашкадавала, што ўсё склалася менавіта так!

Іра нарадзілася ў пасёлку Сасновы Бор Светлагорскага раёна. Прыгожая назва, праўда? Быццам бы сам лёс ужо тады падказваў дзяўчыне, што яе будучыня будзе звязана з лесам. З малых гадоў усе гульні Іры праходзілі вакол дрэў. Сям'я часта хадзіла ў грыбы і ягады. «З прафесіяй неяк усё сімвалічна склалася. Або, як той казаў, выпадковасці не выпадковыя?» — усміхаецца суразмоўніца.

Ірына — інжынер па лесааднаўленні і меліярацыі. Асноўныя абавязкі дзяўчыны — кантроль за лесакультурнымі работамі — пасадка дрэў і іх догляд.

— Вырошчванне лесу — доўгі і карпатлівы працэс, — расказвае дзяўчына. — Усё пачынаецца з нарыхтоўкі шышак. Затым яны перапрацоўваюцца. У нашым лясгасе ёсць свая шышкасушыльня. Так атрымліваецца насенне, якое праходзіць апрацоўку. Згодна з класамі і якасцю мы высейваем яго ў гадавальніку. Праз год вырастаюць паўнавартасныя сеянцы.


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Іх высаджваюць на той тэрыторыі, дзе прайшла высечка лесу. На працягу трох гадоў гэты ўчастак трэба аблясіць. Або пакінуць пад натуральнае аднаўленне. Высаджваюцца елкі, хвоі, алешыны, дубы, клёны, ліпы, ясені. На тэрыторыі Жлобінскага лясгаса пераважае хвоя.

— Менавіта ўвесь гэты працэс ад пачатку да канца я і кантралюю. Мне неабходна дакладна падлічыць, на якой плошчы і што будзем высаджваць. Праца адказная, патрабуе ўседлівасці, — канстатуе спецыяліст. — Прымаю ўдзел і ў пасадцы лесу.

— У сваёй працы Ірыне даводзіцца карыстацца шматлікімі нарматыўнымі дакументамі. Я адразу сказала: пакуль ты не паедзеш у лес, не памацаеш усё сваімі рукамі, не ўбачыш на свае вочы, будзе цяжка. На паперы напісана адно, а на практыцы — іншае, — упэўнена **Ірына КРУКОЎСКАЯ, начальнік аддзела лясной гаспадаркі і лесааднаўлення.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

# ГАЛОЎНАЕ — ТРЫМАЦЦА Ў СЯДЛЕ!



**Найлепшыя аўтары апроч дыпломаў атрымаюць і прызы з сімволікай «Звязды».** Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

**Хачу пазнаёміць чытачоў з Дзіянай УНГУР — сямнаццацігадовай школьніцай, маёй аднакласніцай, якая даўно займаецца конным спортам. Яна пагадзілася крыху расказаць пра сваё захапленне і ўласныя дасягненні.**

— Любоў да коней узнікла ў мяне яшчэ ў раннім дзяцінстве, — кажа Дзіяна. — Першапачаткова я два гады займалася проста для сябе, а затым ужо — прафесійна.

Цэнтр коннага спорту, куды дзяўчына ездзіць пасля школы, знаходзіцца даволі далёка ад Мінска, але чаго толькі не зробіш дзеля любімага занятку. Ахвяруеш практычна ўвесь свой вольны час!

— Трэніроўкі праходзяць так, — расказвае Дзіяна. — Я еду туды адразу пасля заняткаў, пераапранаюся, чышчу каня, сядлаю яго і выязджаю разам са сваёй групай. Спачатку ідзе размінка, а затым адпрацоўка элементаў, праца над тэхнікай.

Часам трэніроўкі бываюць неверагодна складанымі. Але сапраўдны спартсмен ніколі не павінен страчваць сілу духу ці баяцца, а таксама мусіць быць гатовым да таго, што прыйдзецца шмат працаваць.

— На трэніроўках я стамляюся не толькі фізічна, але і маральна, таму што ў кожнага бываюць такія моманты, калі нешта не атрымліваецца, — працягвае Дзіяна. — Але не ўпадаю ў роспач і іду да канца, зноў сядаючы ў сядло.

Таксама Дзіяна дала некалькі невялікіх парад пачаткоўцам і ўсім, хто хацеў бы заняцца конным спортам:

— Для пачатку трэба жаданне, вялікае жаданне стаць дасведчаным вершнікам. У конным спорце, як і ў любым іншым, вельмі важна быць працавітым. А яшчэ абавязкова трэба давяраць свайму каню, не баяцца, таму што калі ты не ўпэўнены ў сабе, то жывёла гэта адчувае. Таму трэба верыць і ў сябе, і ў свайго каня. І нарэшце, ні ў якім разе нельга спыняцца, калі табе гэта сапраўды падабаецца.



Дзіяна займаецца трохбор'ем, спаборніцтвы па якім доўжацца тры, а часам і чатыры дні. У гэты час дзяўчына афіцыйна вызвалена ад заняткаў у школе. Пакуль яна з'яўляецца прэтэндэнтам на званне кандыдата ў майстры спорту — пагадзіцеся, вельмі нядрэннае дасягненне для яе гадоў. Хто ведае, магчыма, мы ўбачым Дзіяну ў спісе майстроў коннага спорту ў будучыні.

**Ксенія СІГАЛАВА, вучаніца 11 класа СШ № 23 г. Мінска.**

▸ ПРА АЎТАРА

Ксенія захапляецца музыкай, навукай і літаратурай. Піша песні на англійскай, вершы і апавяданні — на рускай і беларускай мовах. У дзесяць гадоў наведвала кінашколу «Сінема», дзе знялася ў дзвюх серыях «Ералаша».

Кожны год дзяўчына ўдзельнічае ў школьных алімпіядах па хіміі, матэматыцы, рускай, англійскай і беларускай мовах, біялогіі, гісторыі. Любіць падарожнічаць: пабывала больш чым у дзесяці краінах і марыць аб'ездзіць увесь свет.

— Збіраюся паступаць на факультэт журналістыкі на спецыяльнасць «Літаратурная работа (творчасць)», — дзеліцца сваімі планамі 17-гадовая аўтарка. — Таксама хачу ў найбліжэйшай будучыні асвоіць фартэпіяна і прафесійна заняцца вакалам.

# ЯК ПА НОТАХ

**Большая палова кантактаў у тэлефоне Юліі ЗІНКЕВІЧ — дзеці і падлеткі. Яны тэлефануюць ёй па некалькі разоў на дзень, каб даведацца, як прайшоў конкурс, паскардзіцца на тое, што нехта захварэў і не зможа прыйсці на заняткі, падзяліцца творчымі ідэямі. І гэта не дзіўна, бо за пятнаццаць гадоў, а менавіта столькі існуе ў Чашніцкім раённым цэнтры дзяцей і моладзі вакальная студыя «ДоМіСолька», Юлія Аляксандраўна стала адным з самых любімых дзецьмі кіраўнікоў.**



Прызнаюся, з нагоды хай сабе і невялікай, але юбілейнай даты, якую студыя адзначыла ў канцы мінулага года, хацелася скрэатывіць і выдаць нешта накшталт: «Пятнаццаць гадоў — пятнаццаць перамог» ці «Пятнаццаць выпускаў за пятнаццаць гадоў». Але не атрымалася. Бо перамог, у тым ліку вялікіх і значных, за гэты час заваявана значна болей, а выпускнікі... Яны сыходзяць і зноў вяртаюцца. Ужо ў статусе студэнтаў самых розных навучальных устаноў, але па-ранейшаму — салістамі вакальнай студыі «ДоМіСолька».

Як, напрыклад, Дзіяна Лявонцьева, якая нядаўна стала лаўрэатам І ступені шматжанравага фестывалю-конкурсу мастацтваў «Пакаленне Z», што праходзіў у рамках міжнароднага фестывальнага праекта «Zvezdo4et». Ці Хрысціна Камінская, якая паспяхова прайшла адбор і зараз рыхтуецца да ўдзелу ў Нацыянальным конкурсе маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні «Маладзечна-2019». Ды ўсе тыя дзяўчаты і хлопцы, якім не хапае часу для спеваў, але ў якіх заўсёды ёсць гадзіна-другая на тое, каб на канікулах абавязкова зазірнуць у цэнтр, сустрэцца з кіраўніком «ДоМіСолькі».

І ці думаў хтосьці з самых першых вакалістаў, што невялікае аб'яднанне па інтарэсах хутка ператворыцца ў сапраўдную фабрыку зорак. Пераможца тэлевізійнага конкурсу «Сузор'е надзей» Вікторыя Шчыкацілава, студэнтка Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага інстытута культуры Ганна Кляшчонак, сённяшні «зорны» склад сярэдняй групы, якая заваявала другое месца ў намінацыі «Выканаўцы армейскай песні» XX Тэлевізійнага фестывалю армейскай песні «Зорка» і яшчэ шмат значных перамог — пералічваць тых, чые таленты былі заўважаны, раскрыты і агранены ў «ДоМіСольцы», можна бясконца.

Таксама бясконца можа гаварыць і пра работу кіраўніка вакальнай студыі. «Я настолькі люблю сваю справу, дзяцей, з такім задавальненнем іду кожны дзень на работу, што знаёмыя мне зайздросцяць, — прызнаецца Юлія Зінкевіч. — Без перабольшання скажу: я сапраўды знайшла сябе». Цяпер Юлія Аляксандраўна дапамагае юным вакалістам у велізарным свеце музыкі знайсці сваё амплуа, тую самую іскрынку, без якой не бывае артыста.

Прычым гэты працэс — справа калектыўная. Бо менавіта так, разам, рыхтуюць у «ДоМіСольцы» літаральна кожны нумар, кожны выхад ці то на раённую, ці то на рэспубліканскую або міжнародную сцэну. Нягледзячы на тое, што трэба ўлічваць мноства самых розных фактараў — тэмперамент дзяцей, іх вакальныя даныя, узровень падрыхтаванасці і шмат чаго яшчэ, вынік заўсёды адзін: прызнанне слухачоў.

Ну а сакрэт таго, як з маленькіх, крыху няўпэўненых у сабе хлопчыкаў і дзяўчат, якія ў цэнтр дзяцей і моладзі прыводзяць за руку бацькі, зрабіць пераможцаў прэстыжных конкурсаў, у Юліі Зінкевіч адзін. І за пятнаццаць гадоў ён ніколі яшчэ не падводзіў. Каб запаліць яскравы талент, трэба спачатку загарэцца самой, упэўнены педагог. І тады зусім не цяжка будзе з іскрынкі атрымаць вялікае полымя, імя якому — творчае натхненне.

Жыццё ў вакальнай студыі распісана як па нотах. Да невялікага юбілею «ДоМіСолька» атрымала вялікі падарунак: пастановай Міністэрства культуры студыі было прысвоена ганаровае званне «Узорны калектыў». А гэта ўжо абавязвае. І да таго, каб трымаць высокую планку, і да таго, каб не расчараваць заўсёды ўдзячнага гледача. А таму трэба многа працаваць. Ды не, не працаваць: тварыць, жыць гэтай творчасцю, гарэць новымі ідэямі, вынаходкамі і абавязкова скараць новыя вяршыні. Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя.

**Дар'я РАЖКО, вучаніца 11 класа Чашніцкай гімназіі.**

▸ ПРА АЎТАРА

— Добры дзень, мая сяброўка «Чырвонка»! На гэты раз з задавальненнем канстатую, што я з маладзёжным дадаткам газеты «Звязда» ўжо добра знаёмая, бо выпісваю і чытаю гэтае друкаванае выданне, — кажа пра сябе наша чарговая аўтарка Дар'я. — Удзел у конкурсе «Я малады. І мне не ўсё роўна!..» прымаю не першы раз. І хачу сказаць вялікі дзякуй за тое, што даяце пляцоўку для самавыяўлення нам, маладым, дзеліцеся вопытам, дапамагаеце зрабіць першыя і такія важныя крокі ў свет творчасці.

Мне 16 гадоў, зараз я вучуся ў выпускным класе і адначасова рыхтуюся да паступлення на журфак БДУ, таму проста не магла абысці бокам заўсёднае «вастрыце пёры!».

*Заканчэнне конкурсу «ЧЗ» у бліжэйшым нумары.*

*Камертон настрою*

# ЗНАЙСЦІ СВАЮ «АТЛАНТЫДУ»

## Пачаць размаўляць на беларускай мове — проста

**Хто не чуў легенды пра Атлантыду?! Пра чароўны востраў, які быццам бы паглынулі марскія хвалі. Людзі і зараз не спыняюць пошукі гэтага цуду. Студэнт Мікіта ВУШАЎ упэўнены, што лёс Атлантыды і лёс беларускай мовы вельмі падобныя. З цягам часу наш дзівосны скарб — родная мова — быў часткова згублены. Каб нанава адкрыць яго, хлопец стварыў маладзёжны праект «Атлантыда».**
**Ён быў запушчаны ўвосень мінулага года. Яго мэта — папулярызацыя беларускай мовы і культуры сярод студэнтаў і выкладчыкаў БДУ. Актывісты праекта арганізуюць прагляды фільмаў на роднай мове, экскурсіі ў музеі, інтэрв'ю са знакамітымі беларусамі.**

Мікіта, кіраўнік і ідэйны натхняльнік «Атлантыды», вучыцца на другім курсе факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ. Бацькі хлопца заўсёды размаўлялі па-руску, таму доўгі час беларуская мова была для яго толькі вучэбным прадметам у школе. Але ў старшых класах усё змянілася. Мікіта пазнаёміўся з беларускамоўнымі аднадумцамі, зацікавіўся айчыннай літаратурай.

— Больш за ўсё мяне натхніў настаўнік па астраноміі. Ён выкладаў прадмет па-беларуску. У той час я рыхтаваўся да алімпіяды і на працягу трох месяцаў чуў замест «солнце» — «сонейка», а замест «звёзды» — «зорачкі». Лёд у маім сэрцы растаў, і я вырашыў паспрабаваць перайсці на беларускую мову, — успамінае Мікіта.

Хлопец пачаў пісаць на ёй у сацыяльных сетках, паралельна вывучаючы новыя словы і ўспамінаючы граматычныя правілы. Наступны крок — гутаркі на мове з сям'ёй і сябрамі, а потым і з усімі навокал.

— Гэта быў нялёгкі шлях, — прызнаецца студэнт. — Падчас кардынальнай перамены я сустрэў шмат людзей, якія мяне падтрымалі. Вось толькі самі яны не адважваліся зрабіць тое ж, бо не сакрэт, што ў нашым грамадстве па-рознаму ставяцца да беларускамоўных. Тады ў мяне з'явілася ідэя: чаму б не стварыць такую платформу, дзе можна было б акунуцца ў беларускамоўнае асяроддзе? Каб проста можна было прыйсці і паразмаўляць, без усякага сораму.

На той момант у хлопца ўжо быў вопыт у арганізацыі сацыяльных праектаў. Увесну студэнт запусціў рух «Вандровар» — аб'яднанне аматараў веласіпедаў. Наступным праектам для Мікіты стала «Атлантыда». Хлопец сабраў каманду сяброў, разам з якімі распланаваў усе дэталі і падзяліў абавязкі.



Мікіта Вушаў.

— Шмат часу сышло на тое, каб распаўсюдзіць інфармацыю праз знаёмых, праз сацыяльныя сеткі, — расказвае Мікіта. — Зараз у нашай суполцы «УКантакце» больш за 500 чалавек. Акрамя таго, мы атрымалі каля 70 анкет ад тых, хто хацеў бы нам чымсьці дапамагаць.

**«На працягу трох месяцаў чуў замест «солнце» — «сонейка», а замест «звёзды» — «зорачкі». Лёд у маім сэрцы растаў, і я вырашыў паспрабаваць перайсці на беларускую мову».**

Пакуль у рамках праекта праводзяцца чатыры мерапрыемствы. Першае — «Музеі». Удзельнікі дамаўляюцца і разам ідуць на экскурсію. Студэнты ўжо наведалі Нацыянальны гістарычны музей, дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Лошыцкую сядзібу і Музей гісторыі медыцыны Беларусі.

Яшчэ адна ініцыятыва «атлантаў» — «Кіно на мове». Гэта прагляд фільмаў у перакладзе на беларускую ў прыемнай кампаніі і ўтульнай атмасферы. З сабой прыносяць гарбату, прысмакі, а пасля дзеляцца ўражаннямі ад кінакарціны.

Наступнае «дзіця» праекта — «Хуткія спатканні». 15 хлопцаў і 15 дзяўчат збіраюцца ў сталоўцы галоўнага корпуса БДУ. У кожнай пары ёсць пяць хвілін, каб пазнаёміцца. Затым хлопцы падсаджваюцца да наступнай дзяўчыны. Кожны з удзельнікаў адзначае ў спецыяльнай «Карце сімпатый», ці спадабалася ім гутарка з чалавекам. Калі ўсе 15 спатканняў завершаны, арганізатары збіраюць і правяраюць анкеты. У выпадку ўзаемнай сімпатыі ўдзельнікам дасылаюцца кантакты тых, хто ім спадабаўся.

— Кожны выбірае для гутаркі тую мову, якая яму зручная. Але мы папярэджваем удзельнікаў: калі яны хацелі папрактыкавацца ў беларускай — гэта выдатная магчымасць. Бо ўсіх людзей на «спатканні» ты бачыш упершыню, таму і размаўляць можаш не так, як звычайна, — лічыць кіраўнік «Атлантыды».


Падчас сустрэчы з Віктарам Бабарыкам.

Чацвёртае мерапрыемства — «Размова» — інтэрв'ю са знакамітымі беларусамі. На момант падрыхтоўкі публікацыі ў рамках праекта праводзілася толькі адна такая сустрэча — з банкірам Віктарам Бабарыкам. А пасля былі яшчэ «Размовы» з IT-прадпрымальнікам Юрыем Мельнічакам і гуртом Naviband. Бізнесмен згадзіўся на інтэрв'ю вельмі хутка — дастаткова было толькі напісаць яму ў «Фэйсбуку». На працягу дзвюх гадзін студэнты задавалі Віктару пытанні, а пасля відэаверсія гутаркі з'явілася ў сацыяльных сетках.

— Герой адразу папярэдзіў, што будзе адказваць па-руску. Але гэта зусім не было праблемай, — сцвярджае Мікіта. — Мэта мерапрыемства — паказаць, што ў Беларусі шмат сапраўды крутых людзей. Пакуль не буду раскрываць інтрыгу, толькі скажу: у нашым спісе каля 50 прозвішчаў тых, каго мы яшчэ плануем запрасіць.

Мікіта ўпэўнены, што папулярызацыя беларускай мовы пачынаецца з разбурэння стэрэатыпаў аб ёй:

— Мы хочам даказаць, што пабеларуску размаўляюць не толькі вяскоўцы і настаўнікі. Я ведаю, што некаторыя нашы суайчыннікі чуюць мову вельмі рэдка. Але чым часцей ты сустракаешся з пэўнай з'явай, тым больш звыклай яна для цябе становіцца. На мерапрыемствах «Атлантыды» мы не прымушаем нікога выкарыстоўваць толькі беларускую. Аднак у той жа час на ёй размаўляюць арганізатары, друкуюцца анкеты. Такім чынам чалавек усведамляе: беларуская мова, як і любая іншая, — звычайны сродак перадачы інфармацыі.

Зараз праект займае ў хлопца вялізны кавалак часу. Але спыняцца на дасягнутым ён не збіраецца. «Атлантыда» падарыла Мікіту і новыя знаёмствы, і карысны вопыт. Напрыканцы просім кіраўніка праекта падзяліцца сакрэтам, як усё паспець.

— Вельмі проста — не спаць да пяці гадзін раніцы, — смяецца ён у адказ.

**Ганна ЯЎСЕЙЧЫК,**
**студэнтка IV курса**
**факультэта журналістыкі БДУ.**


На «Размове» ў фармаце інтэрв'ю.

*Каманда падтрымкі*

# Вітаю, куды пойдзем на каву?

**«Ці можна набыць квіткі загадзя?», «Трымайце бірульку», «Рахунак, калі ласка»... Каб часцей чуць такія фразы па-беларуску ў кавярнях, рэстаранах ці кінатэатрах, каманда платформы падтрымкі беларускай мовы «Say.by» супольна з Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН стварыла адмысловую мабільную праграму.**

— Калі расказвалі, што запраўкі «А-100» пяройдуць на беларускую мову, мы не маглі паверыць! — гаворыць **кіраўнік платформы Аляксандр ШАСТАКОВІЧ.** — Потым даведаліся пра іншых і вырашылі: трэба аб'яднаць усе беларускамоўныя месцы. Тады ж стварылі сайт Say.by, на якім ахвотныя могуць размясціць звесткі пра сваю кампанію. Пазней распрацоўшчык Міхаіл Касцюковіч прапанаваў зрабіць мабільную праграму.

З яе дапамогай вы можаце знайсці найбліжэйшыя да вас крамы, гасцініцы і іншыя ўстановы, дзе абслугоўванне вядзецца па-беларуску, уключыць міні-размоўнік ды паспрабаваць гаварыць на роднай мове. Акрамя звыклых і простых «Калі ласка», «Дзякуй», «Да пабачэння», можна прачытаць і паслухаць, як правільна ўжываць і вымаўляць тэматычныя выразы. «Мне патрэбна падрабязная карта горада», калі вы ў кнігарні, «Люблю свежы водар пасля дажджу», калі хочаце пагутарыць пра надвор'е... Побач прапануюць пераклад на рускую і англійскую мовы.

Зараз у праграме распрацаваны раздзелы «Кавярня», «Кіно», «Музей», «Надвор'е», «Рэстараны і кавярні», «Таксі», «Тэатр», «Запраўка». Каб карыстальнікі былі ўпэўненыя ў правільнасці сказаў, іх абавязкова правяраюць на памылкі ў Інстытуце мовазнаўства. Агучкай жа займаецца каманда Gavarun.by, якая неаднаразова перакладала сусветна вядомыя фільмы на беларускую мову.

Усяго ў камандзе — 11 чалавек: распрацоўшчыкі, дызайнеры, каардынатары. А новыя ўстановы шукаюць так званыя амбасадары. Яны арыентуюцца на чуткі, правяраюць сацыяльныя сеткі, звяртаюць увагу на шыльды, напісаныя па-беларуску. Аднак кампаніі могуць дадаць інфармацыю і самі.

Каманда стараецца праверыць, ці сапраўды ў сферы абслугоўвання з кліентамі размаўляюць па-беларуску. Але гэта атрымліваецца не заўсёды. «Напрыклад, у рэстаранах — некалькі змен афіцыянтаў, — кажа Аляксандр. — Усё ўдакладніць цяжка». У гэтым выпадку карыстальнікі самі могуць напісаць на электронны адрас платформы.

Праграма працуе на аперацыйных сістэмах Android і IOS, яе можна спампаваць праз Google Play і App Store.

Акрамя гэтага, для рэстаранаў і кавярняў Say.by выпускае сурвэткі з беларускімі выразамі, друкуе размоўнікі для персаналу, праводзіць маштабныя мерапрыемствы. Так, на Дзень роднай мовы яны арганізавалі квэст у чатырох гарадах: Мінску, Лідзе, Магілёве і Віцебску.




— Плануем і новыя праекты, — расказвае кіраўнік платформы. — Але пакуль што наша задача — дадаць як мага больш звестак пра ўстановы. Таксама хочацца, каб персанал у такіх кампаніях першым вітаў наведвальнікаў па-беларуску.

**Юлія АДАМОВІЧ, студэнтка IV курса**
**факультэта журналістыкі БДУ.**

Агульны інтарэс



# Выходзіць за межы праграмы

## Гэта найпершы пастулат маладога педагога

**Наталія СЕМЯНЮК — настаўніца беларускай мовы і літаратуры. Пазалетась, пасля заканчэння Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, яе размеркавалі ў Раваніцкую сярэднюю школу, што на Чэрвеньшчыне. За час працы дзяўчына асвоілася ў калектыве і абрала ўласны стыль навучання.**

— Калі ехала сюды, асабліва нічога не чакала. Думала, будзе што будзе. Але не расчаравалася! Калегі заўсёды дапамагаюць, дзеляцца досведам. А мае вучні — здольныя і таленавітыя.

***— Чым захапіла прафесія настаўніка?***

— Мне заўсёды падабаліся беларуская мова і гісторыя. Не разумела, чаму людзі саромеюцца размаўляць на роднай мове. Гэта ж тое, што адрознівае нас як нацыю ад іншых! Таму яшчэ ў школе вырашыла, што буду настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. Вялікі дзякуй бацькам, якія дапамагалі мне ў гэтым... Цяпер выкладаю ў 6, 8, 9, 10 і 11 класах і маю класнае кіраўніцтва.

***— Які падыход да дзяцей вы абралі?***

— Спачатку вырашыла быць строгай. Але доўга так не змагла і стала сама сабой. Безумоўна, на мяне паўплывалі мае школьныя настаўнікі і ўніверсітэцкія выкладчыкі. Ці хацела б я быць падобнай на іх? Не ведаю. Усе мы, педагогі, думаем па-рознаму. І ва ўсіх свой, адмысловы падыход да вучняў.

***— Першы працоўны дзень запомніўся?***

— Так. Я тады вельмі хвалявалася: як успрымуць мяне старэйшыя калегі, клас, у якім далі кіраўніцтва? Да першага ўрока ў пятым класе рыхтавалася некалькі дзён, шукала цікавую інфармацыю. Хацела, каб у вучняў пасля яго засталіся толькі станоўчыя эмоцыі. І здаецца, гэта атрымалася.

***— Падрыхтоўка да ўрока — сур'ёзны працэс...***

— Безумоўна. У першы год яна займала ў мяне вельмі шмат часу. Цяпер жа, калі набыла пэўны вопыт, рыхтуюся ад 45 хвілін да паўтары гадзіны. Стараюся расказваць вучням штосьці новае і незвычайнае, каб зацікавіць іх. Хочацца, каб іх мысленне выходзіла за межы школьнай праграмы, каб яны былі развітыя ўсебакова, маглі разважаць самастойна і не баяліся выказваць уласнае меркаванне. Напрыклад, аналізуючы прачытаныя творы, вучні могуць паставіць сябе на месца герояў і падумаць, што б яны рабілі ў той ці іншай сітуацыі.

***— Ці ёсць у школьнай праграме пісьменнікі і творы, якія вам асабліва цікавыя?***

— Найбольш захапляюся Уладзімірам Караткевічам. Вельмі падабаецца яго «Дзікае паляванне караля Стаха». У школе гэтая аповесць не вельмі зачапіла. Але з узростам прыйшло пераасэнсаванне прачытанага: твор прываблівае яркім і незвычайным сюжэтам, вытанчаным апісаннем характараў герояў. Таму раю вучням перачытаць яго праз некалькі гадоў... Таксама не можа пакінуць абыякавым творчасць Васіля Быкава. Лёс яго герояў — жыццёвы і кранальны, а вайна ў творах — не прыхарошаная.

***— У педагогаў не так шмат вольнага часу, нават дома. Як яго бавіце?***

— Стараюся пабыць з блізкімі людзьмі. Займаюся самаадукацыяй. Вельмі люблю бег на доўгія дыстанцыі. Захапляюся ім са школы, але, на жаль, пакуль яшчэ ні разу не ўдзельнічала ў спаборніцтвах. Саромеюся...

***— Аб чым марыць як настаўніца?***

— Што пакаленне, якое я вучу роднай мове, будзе карыстацца ёй у паўсядзённым жыцці. І, калі мне выпала магчымасць зараз звярнуцца да вялікай аўдыторыі, скажу: не саромейцеся нашай мовы, любіце яе, падтрымлівайце. Няхай яна гучыць як мага часцей!

**Юлія АДАМОВІЧ, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

# УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З ШЫШАК...



### «Угоддзі» з трох дрэў

— Добра памятаю свае першыя працоўныя дні. Я прыйшла ў момант пасадкі лесу. Сакавік, красавік, май — «гарачы» час. Таму сарыентавацца і паглыбіцца ў сутнасць спраў давялося хутка. Дзякуй вопытным калегам, што дапамаглі, — узгадвае Ірына. — Зараз працую пераважна ў кабінеце з 8 да 17 з перапынкам на абед. Раз-два на тыдзень бываю ў лесе, у гадавальніку — часцей. Частку таго, што вырошчваем у ім, пакідаем сабе, астатняе — прадаём іншым лягасам. Рэалізацыяй пасадачнага, дэкаратыўна-пасадачнага (туя, ядловец і інш.) матэрыялу займаюся таксама я.

Цікава, што да таго, як Ірына прыйшла ў лясную гаспадарку, для яе паняцце «лес» складалася з дуба, хвоі, елкі — «базавых» дрэў, якія дзяўчына бачыла дома:

— А потым трапіла ў гадавальнік плошчай 25 гектараў з 50 відамі дэкаратыўных раслін. Вось як, аказваецца, бывае! Google тады мне добра дапамог.

На жаль, прызнаецца дзяўчына, яе матуля больш любіць кветкі, чым туі або ядловец. Інакш яна разгулялася б, выкарыстала ўсе свае веды на прысядзібным участку! «Матуля толькі на бууякі пагадзілася. Прывезла ёй, пасадзілі», — дадае суразмоўніца.

— Дзяўчат у лясной галіне шмат?

— Такім прыгожым маладым кадрам мы заўсёды рады. Асабліва задаволеныя мужчыны, — жартуе Ірына Крукоўская. — Увогуле, дзяўчаты ў лясной гаспадарцы — справа звычайная. Яны ў першую чаргу прыўносяць парадак. Парадак ва ўсім...

**«У Лугавірнянскім лясніцтве шмат ласёў. Казулі сустракаліся, зайцы. Узімку па слядах магу вызначыць, што за жывёла прабягала».**





### У яднанні з прыродай

Плошча Жлобінскага лягаса складае больш за 80 тысяч гектараў, у тым ліку пакрытых лесам — 71,4 тысячы гектараў. Лягас складаецца з дзевяці лясніцтваў.

— У Лугавірнянскім лясніцтве шмат ласёў. Бачыла іх некалькі разоў. Казулі сустракаліся, зайцы. Узімку па слядах магу вызначыць, што за жывёла прабягала, — расказвае Ірына. — У лесе па сонцы і моху мы не арыентуемся. Гэта толькі ў кіно прыгожа выглядае, — смяецца. — Аддаём перавагу сучасным тэхналогіям. Напрыклад, мабільнай праграме «ГісЛес». Яна дапамагае сарыентавацца, дзе ты знаходзішся, падказвае, як трапіць у неабходнае месца ўгоддзяў.

Ірына лічыць, што культура наведвання лесу ў нашых людзей ёсць. Але заўсёды знойдуцца тыя, каму закон не пісаны:

— Вогнішчаў ва неўстаноўленых месцах разводзіць, на мой погляд, сталі менш. А вось смецце ў лес звозяць актыўна! Апошняе мяне асабліва здзіўляе. Як можна не разумець, што прырода — гэта багацце, якое трэба берагчы? Інакш што пакінем будучым пакаленням? Родныя і знаёмыя заўсёды кансультуюцца са мной, пытаюцца пра розныя навашвядзенні і змяненні ў лясной галіне. Напрыклад, шмат хто тэлефанаваў і ўдакладняў, ці праўда, што дазволілі чарніцы збіраць камбайнамі, — кажа спецыяліст.

Ірына жыве ў інтэрнаце. Пакой дзяўчыне лягас выдзеліў амаль адразу, як яна прыступіла да сваіх абавязкаў:

— Да лясніцтва хвілін дзесяць пешшу. Зручна! Увогуле, у Жлобіне нятаннае жыллё, таму такая падтрымка з боку работадаўцы вельмі каштоўная.

### Дзяўчына скрозь і ўсюды

Зараз малады спецыяліст актыўна рыхтуецца да вяселля. Урачыстасць запланаваная на жнівень. Жаніх родам са Жлобіна. Пара не рвецца ў сталіцу, плануе застацца ў невялікім утульным горадзе.

**Цікава, што да таго, як Ірына прыйшла ў лясную гаспадарку, для яе паняцце «лес» складалася з дуба, хвоі, елкі — «базавых» дрэў, якія дзяўчына бачыла дома.**

У Іры, як і ў яе калег, ёсць некалькі камплектаў формы: парадна-выхадная, паўсядзённая, рабочая:

— Зручна! Не трэба гадзіну круціцца каля люстэрка і думаць, што апрануць на працу! А якая эканомія для будучага сямейнага бюджэту! Абутак таксама выдаюць.

— Як з такім манікюрам лес саджаць? — пагдядаю на ярка-бірузовыя пазногці суразмоўніцы.

— Для гэтага пальчаткі ёсць! — усміхаецца Ірына. — Дзяўчына павінна заўсёды заставацца дзяўчынай. Лёгкі макіяж кожны дзень таксама раблю.

Ірына стараецца развівацца ў сваёй сферы самастойна, шмат чытае па спецыяльнасці. Вядзе актыўны лад жыцця:

— Удзельнічаю ў розных спартакіядах за родны лягас. Бегаю на доўгія дыстанцыі. Зімой упершыню стала на лыжы. Спадабалася.

У Іры ў планах пайсці на курсы па ландшафтным дызайне. А яшчэ дзяўчына збіраецца паступаць у Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь на спецыяльнасць «Дзяржаўнае кіраванне і права». Яна ўпэўнена, што веды лішнімі не бываюць...

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**
*Мінск — Жлобін — Мінск.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

*Не паўтарыць нікому!*

# ХВАРОБА, ЯКАЯ ЗАЦЯГВАЕ, — АНАРЭКСІЯ



Такой Вікторыя была падчас хваробы...

**Здараецца, што ў пагоні за прыгожай фігурай некаторыя дзяўчаты зусім перастаюць есці. А гэта прыводзіць да сур'ёзных праблем. Анарэксія — хвароба, звязаная з расстройствам харчовых паводзін: праяўляецца, калі чалавек імкнецца схуднець, баіцца патаўсцець, абмяжоўвае сябе ў ежы, мае скажонае ўяўленне аб уласным целе, з-за чаго хутка губляе вагу. Анарэксія часцей сустракаецца ў падлеткаў. Узровень смяротнасці сярод хворых на яе і булімію (калі чалавек мэтанакіравана выклікае ў сябе ваніты пасля кожнага прыёму ежы. — Аўт.) высокі: расстройствы знаходзяцца на першым месцы па гэтым паказчыку сярод усіх псіхічных захворванняў. Чым раней чалавек звяртаецца па дапамогу, тым больш у яго шанцаў на выздараўленне. Бо многім цяжка не толькі пачаць лячэнне, але і выявіць прыкметы гэтай самай хваробы. Асабісты вопыт — тое, што можа паўплываць на нас, дапамагчы пазбегнуць памылак. Наша гераіня Вікторыя ПРЫГОДСКАЯ гатовая ім падзяліцца.**

Дзяўчыне 21 год. Заканчвае факультэт журналістыкі БДУ, стажыруецца на радыё, тэлебачанні, захапляецца кітайскай мовай. Думкі аб пахудзенні больш не трывожаць яе, як у падлеткавым узросце. Тады, у 15 гадоў, у Вікі з'явілася вялікае жаданне змяніць сваё цела, што прывяло да сур'ёзнага захворвання. Усяго за паўгода яна схуднела на 35 кілаграмаў.

— Я з дзяцінства была поўненькая. Як гэта часта бывае ў школе, дзеці дражнілі з-за лішняй вагі. Гэта чапляла, але не раніла. А ў дзявятым класе з'явілася моцнае жаданне падабацца, адчуваць упэўненасць у целе. Хацелася быць найлепшай ва ўсім, у знешнасці ў тым ліку. Спрабавала розныя дыеты: пітную, яблычную, шакаладную. Часу страціла шмат, але выніку не было. Да таго ж мая мама — шэф-повар, таму дома заўсёды была смачная сытная ежа.

> **«Мама была не супраць, бо не ведала, да чаго гэта прывядзе. Я і сама не ведала. Гэта як кнопка, якую рэзка ўключыла, а выключыць ужо не змагла».**

З цягам часу думкі аб пахудзенні сталі дакучлівымі. Віка памятае, як ішла па вуліцы, спынілася і сказала сабе: «Хачу быць самай прыгожай на выпускным балі. Трэба худнець». Гэта быў пераломны момант.

— У кожнай дзяўчыны ёсць пэўныя праблемныя зоны. У мяне гэта жывот, бакі і рукі. Вырашыла неадкладна заняцца імі. Я перфекцыяністка з вялікай сілай волі, таму адмовіцца ад мучнога, тлустага, салёнага было няцяжка. Складана толькі ў першы месяц: глядзела, як мама гатавала, але нічога не каштавала. Я папярэдзіла яе аб тым, што буду худнець, але яна не ўспрыняла гэта сур'ёзна. Мама была не супраць, бо не ведала, да чаго гэта прывядзе. Я і сама не ведала. Гэта як кнопка, якую рэзка ўключыла, а выключыць ужо не змагла.

> **«У паліклініцы мне сказалі, што, калі ў найбліжэйшы час не адновіцца менструальны цыкл, дзяцей у мяне не будзе ніколі».**

Вікторыя дзеліцца, што першы час усю інфармацыю аб пахудзенні знаходзіла ў інтэрнэце. Яе рацыён складаўся з яблыкаў, грэйпфрутаў, салодкіх глазіраваных шматкоў і вады.

— Рыбу і мяса я амаль што не ўжывала, думала, ад гэтага магу набраць вагу. Абмежавала і час прыёму ежы: пасля 18 — ні кроку на кухню. Лічыла ў галаве калорыі, магла без табліцы сказаць харчовую каштоўнасць любога прадукту. Каб пахудання не праходзіла ў паскораным тэмпе, шмат займалася спортам: скакала на скакалцы, круціла хула-хуп, качала прэс, бегала вакол дома (жыву ў прыватным, таму месца шмат). Гэта захапляла: уваходзіш у пэўную сістэму — і атрымліваеш асалоду ад вынікаў, — прыгадвае суразмоўніца. — Мне падабалася, як я выглядаю, не разумела, што магу напалохаць кагосьці сваім выглядам. Сінякі ад трэніровак здаваліся нормай. Былі моманты, калі мама забараняла мне займацца спортам, таму што не разумела, навошта гэта худой дзяўчынцы. Але я чакала, пакуль яна засне, уставала і практыкавалася некалькі гадзін, каб адпрацаваць упушчанае. Або ў перапынку паміж школай і танцамі бегала па стадыёне, колькі магла.

Фізічнай слабасці Віка падчас хваробы не адчувала. Затое дзяўчына бачыла захопленыя погляды ад іншых людзей, што падымала самаацэнку:

— Я «на выдатна» вучылася ў школе, хадзіла на танцы, у музычную школу. Здавалася, што з кожным днём сіл для гэтага станавілася ўсё больш. Што такое анарэксія, я ведала, але не думала пра яе сур'ёзна. Проста хацела купляць тое адзенне, якое мне падабалася. Мама перажывала, праводзіла выхаваўчыя размовы, але я пераконвала, што яна перабольшвае. Каб мама супакоілася, пры ёй я трошкі ела. Але часцей за ўсё перакладала лыжкай ежу ў талерцы з аднаго боку на другі, аддавала катлеты кату або сабаку.

Дарэчы, маму да захворвання анарэксіяй я ніколі не падманвала. Спачатку гэта і не трэба было: з раніцы да ночы яна на працы. Падтрымліваў малодшы брат — заўсёды прыкрываў, хоць цяпер разумею, што гэта няправільна. Знаёмыя, сябры казалі, каб я спынілася. Але я была пераканана, што ўсё кантралюю. Прыходзячы дадому, раздзявалася і глядзела на сябе ў велізарнае люстэрка. Бачыла свае «хібы» і працягвала галадаць. З-за недахопу ўнутранай энергіі вельмі моцна мёрзла тады, калі ўсім было цёпла. Бліжэй да лета магла хадзіць ледзьве не ў валёнках, аб'ёмных світарах. Мама тым часам паказвала розныя тэлепраграмы пра анарэксічак са словамі: «Глядзі, ты такая ж, як яны». А я адказвала: «Ты сур'ёзна? Яны худыя, я — не».

Хвароба Вікі не суправаджалася булімія́й, але была іншая праблема.

— Крытычныя дні зніклі, калі важыла 54 кілаграмы пры росце 176 сантыметраў. Тады я не звяртала на гэта ўвагі. «Ну сышлі і сышлі, вернуцца», — думала я. Цяпер разумею, што гэта быў дрэнны знак. Падчас хваробы ў мяне пачалі рэзка выпадаць валасы, пазногці таксама мелі не найлепшы выгляд. Я разумела, што хачу стаць здаровай, але ў галаве сядзела думка: «Няўжо ўсе мае старанні былі дарэмныя?» Было шкада і маральна складана.

> **«З-за недахопу ўнутранай энергіі вельмі моцна мёрзла тады, калі ўсім было цёпла. Бліжэй да лета магла хадзіць ледзьве не ў валёнках, аб'ёмных світарах».**

У рэшце рэшт я пагадзілася пайсці да ўрача. У паліклініцы мне сказалі, што, калі ў найбліжэйшы час не адновіцца менструальны цыкл, дзяцей у мяне не будзе ніколі. Я спалохалася. Прызначылі гарманальныя таблеткі, і за наступны год я папраўлілася на 12 кілаграмаў. Не з-за павышанага апетыту, а з-за кантролю з боку мамы. Яна сядзела перада мной і заўсёды чакала, калі я даем. Крыўда на яе заставалася доўгі час, пакуль я не зразумела: мама дзейнічала як магла. Магчыма, без такіх радыкальных метадаў не было б выніку.

Віка канчаткова справілася з хваробай у 18 гадоў. Дзякуючы гэтаму вопыту яна пасталела, зразумела, што ў жыцці насамрэч мае каштоўнасць. Хоць не адмаўляе, што сочыць за харчаваннем дагэтуль:

— Мая фігура не ідэальная, я прыводжу яе ў форму і зараз, але без шкоды для здароўя. Пасля анарэксіі да мяне ў сацыяльныя сеткі пачало прыходзіць шмат паведамленняў з пытаннямі аб пахудзенні ад дзяўчат-падлеткаў. Адказ заўсёды адзін: правільнае харчаванне і заняткі спортам. Да такіх рэкамендацый дадаю: калі не мець правільнага падыходу, можна страціць здароўе. Думаю, кожны павінен ведаць аб магчымых наступствах.

**Дар'я ШЛАПАКОВА, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**



Калі ўсё прайшло, свет зноў заіграў фарбамі жыцця для дзяўчыны.

## Каментарый спецыяліста



**Таццяна ВАЛОВІЧ, урач-псіхолаг:**

— Паводле ацэнак экспертаў, ад 60 да 70 тысяч беларусаў маюць адхіленні ў харчовых паводзінах. Жанчыны пакутуюць на нервовую анарэксію часцей, чым мужчыны, у суадносінах дзесяць чалавек да аднаго. Кожны год фіксуецца тысяча новых выпадкаў у прадстаўніц прыгожага полу ва ўзросце ад 13 да 23 гадоў.

У тры разы часцей хварэюць на булімію, чым на анарэксію. Расстройствы могуць быць выкліканы выхаваннем, звычкамі, асабістым густам, традыцыямі ў сям'і.

Да нядаўняга часу лічылася, што ў аснове анарэксіі ляжыць выключна псіхапаталогія. Але сучасныя даследаванні сведчаць, што гэта цэлы комплекс фактараў, уключаючы генетычную схільнасць. Даследчыкі і псіхолагі актыўна абмяркоўваюць ролю траўміруючых падзей ва ўзнікненні парушэнняў харчовых паводзін. Нервовая анарэксія можа праявіцца адзін раз за жыццё ці стаць хранічным захворваннем. Пацвярджэнне таму — нядаўняе адкрыццё Сінціі Б'юлік (ЗША), вядучага сусветнага спецыяліста па анарэксіі. Каманда навукоўцаў пад яе кіраўніцтвам выявіла ў 12-й храмасоме ўчастак, які адказвае за развіццё гэтай хваробы.

Асобы з парушэннямі харчовых паводзін характарызуюцца перфекцыянізмам, адчуваннем немагчымасці кантраляваць сваё жыццё, павышанай ранімасцю, адзінотай, нізкай самаацэнкай, цяжкасцямі ў распазнанні сігналаў цела. Да таго ж гэта медыцынскі дыягназ, таму зварот да спецыялістаў (псіхатэрапеўта, псіхіятра, псіхолага) лічу абавязковым.

## Открытое акционерное общество «Управление механизации № 79» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, проводимых на электронной торговой площадке «ТОРГИБЕЛ»

| № Лота | Описание предмета электронных торгов | Начальная цена с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 210519001 | Башенный кран КБ-403 (заводской № 1486, год выпуска 1990) | 43 200,00 | 4 400,00 |
| 210519002 | Башенный кран КБМ-401 УХЛ-24 (заводской № 5, год выпуска 2007) | 84 000,00 | 8 400,00 |
| 210519003 | Башенный кран КБ-408 (заводской № 50, год выпуска 1989) | 24 000,00 | 2 400,00 |
| **Местонахождение предметов торгов: г. Минск, ул. Селицкого, 27А. Шаг электронных торгов – 5 %** | | | |

**УСЛОВИЯ**

